## Васіль Быкаў



...у гэтым сшытку – толькі пра тое,
што перажыў, праўда былога...

# Пункціры жыцьця

***Далітаратурная біяграфія***

*Публікацыя Ірыны БЫКАВАЙ.*
*Малюнкі Васіля БЫКАВА.*
*Падрыхтоўка да друку Алеся ПАШКЕВІчА.*

***Чалавек адрозьніваецца ад іншых жывых істотаў тым, што можа ўспамінаць. Ва ўспамінах пісьменьніка спалучаюцца і споведзь, і запавет, і наказ.***

***На Беларусі асобнай кнігай ужо былі апублікаваныя ўспаміны Васіля Быкава “Доўгая дарога дадому”. “Пункціры жыцьця” – гэта першы маштабны подступ да “Доўгай дарогі…”. Аднак у гэтых тэкстах няма паўтораў – нават адзіным сказам. “Пункціры жыцьця”, якія пісаліся Васілём Быкавым у 1993 годзе, яшчэ да паязджанства, арганічна ўвайшлі ў экзістэнцыйны кантэкст ягоных твораў 90-х гадоў. Калі пісалася “Доўгая дарога…”, “Пункціры…” заставаліся ў хатнім архіве на Радзіме. Два сшыткі, сьпісаныя роўным акуратным почыркам, бяз правак, перакрэсьліваньняў, уставак. Як і ўсё жыцьцё Васіля Быкава...***

**СШЫТАК ПЕРШЫ.**

*Сёлета вясной гэты сшытак мне падарыла адна мілая немка-перакладчыца ў Кілі. Сказала: для Вашых твораў.*

*Што ж – трэба пісаць.*

*16 лістапада 1993 году.*

Бачыў у І. Буніна графічную выяву месяцаў, году. Цікава, што ў маім уяўленьні таксама даўно складзеная пэўная выява.




Чорныя ў іх – самыя непрыемныя. У сэнсе надвор’я, канешне.

Можа, самае перашае ўражаньне маленства, якое запомнілася – спалох.

Было лета, і я з бацькам ехаў на нейкае сьвята ў Стайкі. Дарога пайшла на спуск да Камароўскага возера, дзе быў масток цераз пратоку, конь пабег з гары, і я спалохаўся, што мы ўвалімся ў возера. Бацька засьмяяўся, і я стаў спакайнец. Было мне тады, можа, год пяць.

Цяпер у Кублічах на месцы царквы – зарослы травой пагорак. А некалі гэта была прыгожая царква з купаламі. Там мяне хрысьціў айцец Забела. Памятаю прычасьце – лыжачку салодкага віна – і хор. Сьпеў таго хору запомніў на ўсё жыцьцё. І, здаецца, пасьля нічога болей прыгожага ня чуў у жыцьці.

Бунін піша ў дзёньніку, што ўсе свае творы выдумаў. Баюся сабе прызнацца, але, мусіць, і я таксама. А пасьля неяк сачыняў “гісторыю стварэньня”, бо няёмка было прызнацца, што прыдумаў. Ды й чытачам нецікава. Але ў гэтым сшытку – толькі пра тое, што перажыў, праўда былога, хоць гэта – адчуваю – будзе нялёгка.

У некага (Рэмарка?) ёсьць выраз: “Дробязі суцяшаюць”. Ня ведаю, як у каго, а ў мяне дык скрозь дробязі раздражняюць. Ці гэта такое жыцьцё? Ці склад характару? Ці ўзрост?

Мяне да літаратуры ў пэўнай меры вялі падручнікі, граматыкі мовы. Расейскай і асабліва – беларускай.

Здаецца, у пятым класе ў граматыцы прыводзіліся прыклады з Коласаўскай “Дрыгвы”, якія дужа інтрыгавалі дзіцячае ўяўленьне. Кніжкі, аднак, не было, і вось неяк улетку ў Селішчах у сельмагу ўбачыў “Дрыгву”. Але ж грошы… Некаторыя хлопцы з вёскі дралі на балоце кару з крушыны, сушылі, пасьля здавалі ў сельпо. Давялося палазіць па кустоўі, трохі насушыў, аднёс у Гушачанскую Слабодку (кіламетраў за

пяць). Купіў “Дрыгву”. Была асалода. Не пашкадаваў ні грошай, ні працы.

А “Як гартавалася сталь” была адна ў школьнага настаўніка, і яе чыталі па чарзе. Мая чарга выпала недзе пад весну, і цяпер памятаю надвор’е, праталіны і радасьць ад таго чытаньня.

Калі вучыўся, здаецца, у шостым класе, зімой захварэў. Прастудзіўся і пасьля прыключылася нешта іншае. Хварэў доўга. Калі крыху ачуняў, ісьці ў школу было позна, і тую зіму я быў дома. Чытаў, перачытваў усё, што было можна знайсьці, але болей за ўсё хадзіў у Двор-Слабодку, пачатковую школу, дзе мне настаўнік Крацёнак даваў кніжкі са школьнай бібліятэкі. Менавіта тады перачытаў ледзь ня ўсю расейскую класіку. І як цяпер пагляджу, тая зіма ў сэнсе адукацыі была куды важнейшай, чым усе іншыя. Недарма кажуць, што дзіця разумнее, як хварэе.

Увогуле, кніжкі браў у бібліятэцы, у настаўнікаў, у сяброў – аматараў чытаньня. У майго аднакласьніка Баброўскага з Чамярычына ад даўніх часоў застаўся куфар са старой літаратурай. Чытаў адтуль кніжкі, якіх не было нідзе: Шылер-Міхайлава, Станюковіча, Дастаеўскага, Пісемскага. У селяніна з Астроўшчыны Бобрыка захавалася падшыўка “Нівы” за некалькі год, выпрасіў, перачытаў усю. Пасьля “Огонёк” з 90-х гадоў XIX стагоддзя.

Тады быў яшчэ малы, яшчэ да школы. Далей гародаў нікуды не хадзіў. І вось аднойчы старэйшы мой сябра Валодзя Галавач кажа: “Пайшлі на возера”. Пайшлі – праз парасьнікі, каля Навінаў, цераз роў, акрай Саўчонкаў. З гары адкрыўся цуд: лясное возера ўнізе, за ім лес на касагоры – прыгажосьць на ўсё жыцьцё.

Пасьля дазнаўся: на высьпе па-над ім было нейкае, яшчэ паганскае, збудаваньне, здаецца, расьлі дубы.

Так возера было са мной у дзяцінстве, на вайне, у чужыне, – як асяродак Радзімы і вобраз хараства.

Усе хлопцы ў вёсцы былі старэйшыя за мяне – хто на два, хто на тры гады. Як адчынілася пачатковая школа ў Міхашонкавай хаце, пайшлі ву-



*Наш падворак.*



*Колішні краявід з падворку.*

чыцца. А я малы, мяне ня бралі. Тады было дужа маркотна, прасіў бацьку пусьціць у школу, і бацька аднойчы павёў. Настаўнік Аўласенка паглядзеў на малога, шасьцігадовага, і кажа: хай ходзіць. Валодзя Галавач зрэзаў на балоце трысьціну, уставіў у яе настаўнікава пёрка – пачалася вучоба.

Палітычныя ліхаманкі перманентна калацілі вёску. Яшчэ пры аднаасобніцкім жыцьці была ільнанарыхтоўка. Патрабавалі здаць усё і яшчэ болей. Хадзілі з вобыскам – ператрасалі лахманы, шукалі кужалі. Прымушалі раскручваць конскія путы – на здачу.

Мне было мо год пяць, як прыйшлі актывісты шукаць. Жылі тады яшчэ ў старой хаце, з істопкай, у якой праваліліся столь, і маці ўсё палохала: ня лазь туды, праваліцца. Шукалі-шукалі, нічога не знайшлі, паклікалі мяне: “Мальчик, где отец спрятал лён?”. Зласьлівасьць начальнікаў выклікала ў мяне адпаведнае пачуцьцё, і, помсьцячы, я ім сказаў: “На істопцы”. Яны адразу палезьлі туды, а я зларадна думаў: хай праваляцца і заб’юцца. Аднак не праваліліся, а я ўцёк за сажалку.

У канцы вуліцы таго сяла жыў Азевіч Дзям’ян, аднарукі інвалід першай сусьветнай вайны. Адною (цэлай) рукой ён рамантаваў гадзіньнікі, якімі ў яго былі завешаныя ўсе сьцены. Працаваў ён на падаконьніку, і, як мне цяпер здаецца, рабіў цуды. Шкельцы для гадзіньнікаў, напрыклад, ён выразаў з бакавога лямпавага шкла. Здаецца, ён шмат іншага майстраваў з падручных матэрыялаў. Часам настаўнікі з Кублічаў перадавалі мне свае гадзіньнікі – то ўставіць шкло, то адрамантаваць. Дзёмка заўжды з платы ў адзін рубель даваў мне 20 капеек. Яшчэ ён выпісваў газету “Красная звезда”, якая мяне тады дужа цікавіла: як жа, вайсковая газеціна.

Ці не праз тую газеціну ён у 1937 годзе лёг у Курапаты?

А ягоны сын Дзёмка Дзёмкаў стаў партызанам, нават ад’ютантам камбрыга.

Нашая хата была крайняй у вёсцы, далей было поле і – роў. Вялікая, даўгая аўражына, зарослая алешнікам, ляшчыньнікам. Там жа была і крынічка, у якой бралі ваду. Гэта ў маім дзяцінстве быў цэлы сьвет загадкавага, таямнічага, нязьведанага. Хоць зьведана там было ўсё: усе закуткі, сьцежкі, ручайкі і абрывы, кротавыя і барсучыныя норы, зарасьнікі крапівы, дзядоўніка, маліньніка. Зімой жа па сьцежках і кладках дабрацца да крынічкі было пакутна. І яшчэ горай – выбрацца з рова. Затое ўлетку гэта быў край хараства і таямнічасьці.

Белякоўская пачатковая школа разьмяшчалася, аднак, не ў Белякоўшчыне, а ў Двары-Слабодцы, у вялікім панскім доме, дзе яна займала два пакоі. У адным з іх жыў настаўнік, у другім – састаўленыя ў два рады – стаялі парты. То быў трэці і чацьвёрты класы. Пакуль настаўнік (Троцкі ці Крацёнак) займаліся з адным класам, другі працаваў самастойна. Бывала, я хуценька рабіў заданьне па мове ці арыфметыцы і слухаў, што рабілася ў чацьвёртым класе. Гісторыю, напрыклад. Было дужа цікава. І калі настаўнік задаваў якое пытаньне, на якое ніхто з чацьвёртага класу ня мог адказаць, тады я паднімаў руку з трэцяга. Сьпярша настаўнік зьдзіўляўся, а пасьля прывык. І вось аднойчы кажа:

“Перасаджвайся ты, Быкаў, у чацьвёрты клас”. Я перасеў, скончыў чацьвёрты, але пятага тут не было, а я быў малы, каб хадзіць у Кублічы, і бацька пакінуў мяне яшчэ на год у чацьвёртым.

Гэты клас быў асаблівы, хоць бы па ўзросьце. Побач з дзесяцігадовымі, як я, там сядзелі хлопцы і дзяўчаты (асабліва дзяўчаты) пятнаццаці і шаснаццацігадовыя. Не скажу, каб старэйшыя ажыцьцяўлялі дыктат (як цяпер у школах) над малодшымі, але ўсё ж… Старэйшыя ўжо цікавіліся адносінамі паміж поламі, каханьнем. І вось неяк мяне пачалі дражніць каханьнем да Надзі Кананок, маленькай маўклівай дзяўчынкі са Слабодкі. Праўда, слаўненькая была дзяўчынка, але, здаецца, я з ёй нават не загаварыў ніколі, як і ні з кім пра яе таксама. Між тым нешта прывярэдзілася нашым старэйшым, якія пры выпадку нязлосна кпілі з мяне. Часам было дужа сорамна. І крыўдна. Яшчэ на той час клікалі мяне Базылём.

Мая мама, Ганна Рыгораўна, была родам з вёскі Завулак, што на пару майго дзяцінства апынулася па той бок савецка-польскай мяжы, хоць і была ад маёй вёскі Бычкі праз якіх чатыры кіламетры. Усю маладосьць сваю маці ўспамінала пра родныя мясьціны, пра брата Лявона, што застаўся па той бок, і дужа баялася, каб не надарылася бяда ў 1937-1938 гадах, калі забіралі шмат каго з тых, чые родзічы апынуліся за мяжой. Бог бярог, маіх бацькоў не забралі. Маці была дужа далікатная характарам, ня надта здаровая, часта хварэла. Я ня чуў ад яе якой сваркі з бацькам, ніводнага злосна-пагрозьлівага слова да дзяцей. Усё – ласкава, лагодна, з нейкай застарэлай тугой у душы. Мусіць, таму, што жыцьцё аднеслася да яе даволі драпежна: у гады рэвалюцыі і грамадзянскай вайны яна страціла першага мужа, пасьля (ужо за маёй памяцьцю) памерла яе ад яго дачушка, шаснаццацігадовая Антунінка (ад прастуды). Маці была непісьменная (амаль). І колькі я яе памятаю, заўжды ў працы, у нязбыўным гаротным клопаце – як накарміць, у што апрануць нас, трох. І гэты свой клопат яна несла моўчкі. Толькі ўсё адбівалася на твары, і я змалку


*Белякоўская пачатковая школа.*


*Наша лазьня.*

выдатна адчуваў усе зьмены яе настрою па выразах яе спакутванага твару.

Тады па ўсім краі ішла калектывізацыя. Мужыкоў змушалі ўступаць у калгасы. Не зразумела, навошта была тая дабраахвотнасьць, тыя начныя сходы, якія вырашалі тое, што ўжо было вырашана бяз іх. Некалькі начэй ішоў сход і ў нашай вёсцы, і ўрэшце вырашылі абагульніць. Таго ж ранку пусьцілі па вёсцы актыў выгружаць збожжа (баяліся, што пахаваюць, ці што?), на золаку прыехалі і да нас. Я абудзіўся ад плачу маці, яна галасіла (чаго ніколі я ад яе ня чуў), бо з істопкі выгрузілі ўсё – не пакінулі ні каліва. Чым было карміцца, што пасеяць у гародзе? А на двары стаяў яшчэ сакавік 1933 году, з якога пачынаўся вялікі голад аж да самай вайны. Толькі ніхто ня ведаў таго, што чакае людзей наперадзе.

Уладзімер Хведаравіч, мой бацька, паходзіў з гэтай жа вёскі, нават з суседняй хаты, у якой тады гаспадарыў старэйшы ягоны брат дзядзька Васіль. Была жывая і маці іх, Хвядорыха, якую мы не любілі з тае прычыны, што яна не любіла нас. Рэч у тым, што, як і ў маці, так і ў бацькі гэты шлюб быў другі – першая жонка бацькі памерла, здаецца, ад родаў. Бацька ў дзяцінстве скончыў царкоўна-прыходскую школу ў Кублічах, лічыўся грамацеем у вёсцы. Да яго прыходзілі чытаць-адпісваць лісты непісьменныя салдацкія маці. У маладосьці ён сезонна працаваў на цагельнях у Мітаве. Царскую службу правёў у Гародні, расказваў пасьля пра гэты горад, з якім лёс зьвёў і ягонага сына. У час імперыялістычнай вайны будучы змабілізаваны ў армію генерала Самсонава трапіў з ёй у нямецкі палон. Але ў палоне, казаў, яму пашэнтціла: рабіў у баўэра, дзе да некалькіх “рускіх” парабкаў былі неблагія адносіны. Мусілі рабіць, але і кармілі, і апраналі. Прынамсі, пасьля ў калгаснай рэчаіснасьці ён успамінаў той час з піетэтам, і, мусіць, меў падставу. Бо далей на ягоным жыцьці былі спрэс нэндза і катаклізмы: калектывізацыя, вайна, партызанка, трывога за дзяцей. Сын (я) у вайну быў няведама дзе, дачку Валю немцы некалькі разоў забіралі ў Нямеччыну (адзін раз яна выскачыла з цягніка). Але іншым дасталася болей, і гэта хіба суцяшала.

Характару ён быў не крутога, але з дзецьмі абыходзіўся строга (прынамсі, мне так здавалася, можа, у параўнаньні з мяккай маці). А ўвогуле, усё жыцьцё біўся як рыба аб лёд, і толькі на старасьці дажыўся да ладу і казаў, што хлеба даволі, ёсьць і да хлеба, і нейкая апратка – калі такое было? Толькі жыць ды жыць.

Але менавіта ў такую пару і прыйшоў канец. Памёр у 1966 годзе на дзень Сталінскай Канстытуцыі 5 сьнежня пасьля доўгай і цяжкой хваробы на расьсеяны скляроз.

Урэшце, я другі раз скончыў чацьвёрты клас у Двары-Слабодцы, далей трэба было падавацца ў Кублічы, дзе ўжо вучыліся мае сябры-аднавяскоўцы. Кепска – не было абутку. Сандалікі, што я насіў летась, сталі малыя і ня лезьлі на ступні. Тады бацька прыстасаваў іх арыгінальным спосабам: разрэзаў і надшыў заднікі. (Пята, праўда, не зьмяшчалася на падэшве, але тое не бяда.) Так я ў тых сандаліках дахадзіў да зімы. А зімой здарылася бяда: на лесанарыхтоўках у Пад’язеньні захварэў на

тыфус бацька, паклалі яго ў бальніцу ва Ушачы. Дома не было дроў, каб згатаваць страву, трэба было ісьці ў лес, сьсекчы алешыну, прыцягнуць яе, насекчы. Гэта ўжо быў мой абавязак, часам дапамагаў Валодзя Галавач, мілы хлопец, старэйшы за мяне на тры гады, малодшы сын найдабрэйшай цёткі Анапкі. У лес і ў школу хадзіў я ў апорках, здаецца, гэткі адзін у класе. Неяк на перапынку кліча мяне дырэктар і кажа: ідзі ў сельмаг і выберы сабе чаравікі. Скажы, дырэктар прыслаў. Пайшоў, выбраў, а пасьля заняткаў дырэктар мне ўручыў новенькія, пахучыя чаравічкі, на якія я ня мог нарадавацца. Ідучы цераз Сатавізну дадому, дома таксама. Маці заплакала ад радасьці… Скураны пах тых чаравікаў я чую дагэтуль – такі ён мне быў мілы.

З абуткам ды й вопраткай была пастаянна нявыкрутка: то не было чаго купіць у сельмагу, то не было за што. Кожны год у канцы лета, як трэба было зьбірацца ў школу, мама бедавала: у што апрануць дзяцей? Памятаю, аднойчы пашыла мне кашулю з белых жаночых хусьцінак у кропачку. Але неяк не хапіла, і на грудзях трапіў шлячок, які выдаваў паходжаньне маёй кашулькі, ад чаго давялося дужа перажываць.

А з абуткам… Ледзь ня кожнага дня на золаку ўранку чуў я праз сон, як бацька пры газьніцы то падбівае, то зашывае мае чаравічкі, што дашчэнту ірваліся. Усё ж тры кіламетры па макрэдзі, у сьнезе, цераз балота, па гразі. І кожны дзень. Неяк памарозіў пальцы на нагах, тыдзень ня мог абуцца. Зноў жа прастуды, кашаль. Асабліва дапякаў начны кашаль, які трывожыў бацькоў. Бацька звычайна бурчэў: казаў, не мачы ногі, ня йдзі праз аселіцу… Дык не! Неслух ты, Васька, цяпер во кашляй…

Той ранішні плач маці быў сімвалічным знакам, вяхой на мяжы дзьвюх эпох. З калгасамі пачалася эпоха нечуванай нэндзы, бясхлеб'я, прымусу. Мы былі малыя, а бацькі рабілі ў калгасе штодня – за палачкі, вядома. Увосень пры канчатковым разьмеркаваньні бацька пойдзе па зароблены за год хлеб і прынясе гэты свой заробак у торбачцы на плячы. Канешне, выручаў агарод, бульбачка, кароўка. Але ж і з агароду трэба было здаць бульбу, а таксама малако, воўну, яйкі, сплаціць страхоўку, падатак, пазыку. Дзе браць грошы?

У нас валютнай крыніцай былі курачкі – дзесяць рабенькіх, якія чымсьці карміліся і неяк несьліся. Маці [яйкі] зьбірала. Як зьбіралася дзясяткі трычатыры, бацька ў нядзелю раненька ішоў за 18 кіламетраў у Вушачу і прадаваў: там было даражэй, чым у Кублічах, усё ж райцэнтр. Здаецца, цана была такая: 3 рублі за дзясятак. Во з гэтай валюты і сплочвалі ўсе абавязкі, куплялі соль, газу. Вясной перад Вялікаднем бацька купляў сабе чацьвярцінку гарэлкі, палову выпіваў на сьвяты сьняданак, а другую пакідаў на Каляды. Такое было стаўленьне да алкаголю.

Бадай, кожнай вясны да Вялікадня канчаліся хлеб і бульба, пачыналася пара траўнікаў – жахлівых коржыкаў з лебяды і крапівы. І так аж да жніўня, калі дасьпявала бульба ў агародзе і пачыналі жаць ячмень – на крупы. Жахлівая пара на 7 гадоў – да самай вайны.

Улетку напярэдадні пятага класу пачуў ад старэйшых, што ў Кубліцкую школу прыехала дужа сімпатычная настаўніца расейскай мовы. Увосень давялося пазнаёміцца з ёй. Гэта сапраўды была маладая ўсьме-

шыстая Клаўдзя Якаўлеўна Пашута. Неяк так здарылася, ужо хлопцы-пяцікласьнікі дужа палюбілі яе, а яна нас таксама. (Чаго нельга, зрэшты, сказаць пра нашых дзяўчынак.) З пятага [класу] ўсе наступныя гады прайшлі ў атмасферы тае ўлюбёнасьці ў гэтую настаўніцу, ды і яна неяк не па-настаўніцку выказвала сваю прыхільнасьць. Вядома, я па-расейску вучыўся выдатна, можа таму яна заўжды ласкава адносілася да мяне – бывала, падыдзе, пакладзе руку на мае валасы, далікатна пагладзіць. Канешне, было страшэнна няёмка, амаль сорамна, але і радасна. І хто ведае, што болей значыла ў лёсе падлетка – тая яе навука па расейскай мове і літаратуры ці проста надта чалавечае, мацярынскае ці сястрынскае стаўленьне да яго…

З беларускай мовай усё якраз склалася наадварот. Выкладаў яе суровы, рэзкі Андрэй Дзям'янавіч Курчанка, кульгавы ад нараджэньня. Яго ўсе баяліся, асабліва дзяўчаты. Можа з тае прычыны я ня мог дазволіць сабе ня выканаць хатняга заданьня, ня вывучыць урок. Затое выклікаў ён мяне рэдка, і як толькі я пачынаў адказваць, саджаў на месца і ставіў "выдатна". Іншай адзнакі за гады вучобы ў Кублічах па беларускай мове і літаратуры я ня меў.

Зусім іншае было з матэматыкай. Можа таму, што выкладаў яе чалавек, былы завочнік педінстытуту, які сам бясконца блытаўся ў алгебры каля дошкі. А можа, была тут мая віна. Справа ў тым, што кожную хвіліну я чытаў кніжкі. Чытаў на ўроках, калі можна было. На матэматыцы было можна, бо настаўнік рэдка адрываўся ад сваіх кансьпектаў і дошкі, і, вядома, ягоных тлумачэньняў я ня слухаў, аддаўшыся прыгодам Жуль Верна ці Вальтэра Скота. Таму па алгебры ў мяне заўсёды было "пасрэдна", як па астатніх прадметах "выдатна". Аднойчы ў канцы паўгоддзя дырэктар выклікае і пытаецца: "У чым справа, Быкаў, чаму ў цябе па алгебры скрозь "пасрэдна"? Хацелі цябе залічыць у выдатнікі, ды як з "пасрэдна" залічыш?"

Што праўда, то праўда – цераз тое "пасрэдна" я не пераступіў ні тады, ні праз некалькі год.

У той год, як хварэў і не хадзіў у школу, недзе знайшоў старую, яшчэ дарэвалюцыйнага выданьня кніжку Ж. Верна "З гарматы на месяц". Чамусьці мне здалося, што па-беларуску гэтая кніжка ня выдадзена, бо ня мае перакладу. І некалькі тыдняў я сядзеў над перакладам, сьпісаў дзясятак вучнёўскіх сшыткаў. А пасьля паслаў ліст у "Піянер Беларусі" з пытаньнем, куды мне паслаць пераклад. Атрымаў адказ з тлумачэньнем, што калі ёсьць тэкст расейскі, то навошта беларускі, у нас вывучаюць расейскую мову, таму прачытаюць і па-расейску. Што ж, можа і так, падумаў я, і тыя сшыткі пакрысе пусьціў на хатнія патрэбы.

Поруч з расейскай літаратурай, вядома, захапляла беларуская. Найперш у тыя гады дзяцінства аповесьці Янкі Маўра "Палескія рабінзоны", "Сын вады", "Амок". Але таксама і кніжкі нядаўніх і будучых "нацдэмаў" Міхася Зарэцкага, Васіля Каваля, а таксама Міхася Лынькова. Паэзія цікавіла менш, апроч хіба "Новай Зямлі" Я. Коласа, якая добра чыталася, як складная проза ці што. З прычыны майго "запойнага" чытаньня я ня меў клопату і з мовай – амаль без памылак пісаў

дыктанты і сачыненьні. У старэйшых класах сядзеў на адной парце з Шуркам Андрэйчыкам, які быў даволі слабаваты па мовах, затое добра петрыў у матэматыцы. І мы ўтварылі з ім адметную кааперацыю: на мовах ён бязбожна сьпісваў у мяне, а на матэматыцы – я ў яго. Настаўнікі, мабыць, бачылі тое, але неяк заплюшчвалі вочы. То і дзякуй ім.

Зрэшты, настала пара, калі настаўнікам стала не да вучняў. У Кублічах разьмяшчалася пагранкамендатура, самая вялікая мураванка ў цэнтры мястэчка была занята пагранічнікамі, каля школы была стайня і вайсковы цір, у якім часьцяком бахалі такія прыцягальныя для вучняў стрэлы. Але ішлі рэпрэсіі. Арыштавалі аднаго капітана, мужа нашай настаўніцы Акулавай, пасьля інтэнданта камендатуры (казалі, за шкодніцтва і плот, які ён пабудаваў [і які] паваліў вецер у буру). Пасадзілі нашага дырэктара (таго, што купіў мне чаравікі). Прозьвішча яго было Карчэўскі. (Гэта за тое, што абразіў бюст Леніна ў ДСК, а наша вучаніца Голда Меерсон убачыла і даказала.) Пасадзілі шмат каго з навакольных вёсак, у тым ліку і нашай: Бобрык[а], Азевіча, Барыса Быкава, Лявіцкага, Альхімоўскага і іншых. Бацька таксама кожную ноч чакаў арышту – за матку, у якой былі родзічы па той бок польскай граніцы. Але бацьку неяк бярог Бог. Ці, можа, Назараў Кузьма, наш вясковец, прымак з былых чырвонаармейцаў, які ажаніўся з адной мясцовай жанчынай. Ён быў расеец, актывіст, і, вядома, меў дружбу з пагранічнікамі і мясцовымі гэпэушнікамі. А іх вушацкі начальнік Пераціцькін некалькі разоў начаваў у яго, піў гарэлку, там яны абмяркоўвалі, каго можна ўзяць яшчэ. І бралі. Ніхто з узятых тады не вярнуўся, хоць усе рэабілітаваныя пасьля 1956 г.

Крыху раней да тых масавых рэпрэсіяў мы назіралі незвычайную зьяву – масавы пераход мяжы з Польшчы. Ішла ў асноўным моладзь, хлопцы з гармонікам. Ранічкай, ідучы ў школу, мы бачылі, як іх вялі з пагранзаставы каля Лісічана ў Кублічы. Хлопцы былі вясёлыя, добра апранутыя, у ботах, весела віталіся з намі. А пасьля заняткаў, ідучы дадому, часам мы зноў бачылі іх – на санях ці нават у кузавах палутарак, як іх везьлі пасьля допыту далей, у Полацак. Тады ўжо выгляд іхні быў іншы, ніхто не ўсьміхаўся! Сядзелі, паныла зьвесіўшы галовы, часам з сінякамі на тварах.

Гэта грамілі КПЗБ.

У Астроўшчыне жыў селянін Бобрык, бедны гаротны чалавек з хворай жонкай і трыма малымі хлапчукамі. У той вёсцы ён зьявіўся пасьля рэвалюцыі і вайны. А да таго жыў недзе ў Расеі. Неяк упершыню трапіўшы ў ягоную хату, я быў зьдзіўлены. На яе сьценах віселі некалькі жывапісных (невялічкіх, праўда) карцін, выкананых алейнымі фарбамі, якія бачыў упершыню. Крыху пасьля такія ж карціны (алеем) я ўбачыў у культмагу ў Вушачы, то быў нейкі стэпавы пейзаж і вядомая карціна В. Зайцава “Чапаеў” (копія, вядома). У абедзьвюх карцінах мяне моцна вабіла неба з белымі аблокамі, я некалькі разоў прыходзіў у той куль-

тмаг, каб толькі паглядзець на карціны. Але доўга глядзець было нельга. Сорамна.

А ў Бобрыка быў эцюд з хвояй і хатай, яшчэ, здаецца, з возерам. Яшчэ ў яго былі падшыўкі “Нівы” за некалькі год і “Огонёк”, здаецца, за 90 гады XIX ст.

Не адразу я наважыўся папрасіць пачытаць… А як прачытаў, аддаваць ужо не было каму – ворага народу Бобрыка арыштавала НКВД. І я думаў – ці не праз тыя царскія падшыўкі і панскія карціны на сьценах?

Увосень 1939 году, як вядома, Заходняя Беларусь была далучаная да Усходняй. То была радасьць, асабліва для маці, якая з 20-га году нічога ня ведала пра сваіх у Завулку. Але радасьць хутка змарнела, калі давედалася, што старая мяжа засталася, і яе, як і раней, захоўваюць пагранічнікі, нікога ні туды, ні адтуль не пускаюць. Аднак маці чакала. Між тым настала вясна 1940 году. І з ёй, як заўжды, галадуха, не было хлеба, скончылася бульба. Тады мама наважылася. Неяк уначы бацька павёў яе ў Чырвоны Бор, адкуль яна ўжо адна выправілася парушаць дзяржаўную мяжу. І парушыла, і праз пару дзён вярнулася. Прынесла на плячы ў торбачцы кілаграмаў шэсьць мукі і невялічкі кумпячок, наплакалася, нахвалявалася і, здаецца, пастарэла на дзесяць год. Брат Лявон жыў з немалой сям’ёй небагата, але такой нэндзы, як у калгасах, ня ведаў і толькі дзівіўся – лаяўся, як мама расказвала пра яе жыцьцё. Мабыць адчуваў, што гэткае ж неўзабаве чакае і яго.

У дзяцінстве чытаў таксама газеты – сваю раённую, “Віцебскі рабочы” [абласную], выпісваў (зрэдчас) “Пионерскую правду”. Хацелася верыць у праўдзівасьць таго, што пісалі газеты. А ў газетах тады было скрозь выкрыцьцё ворагаў народу і выкананьне планаў пяцігодкі. Калі бацька скардзіўся на жыцьцё, спрабаваў суцяшаць: вось скончыцца пяцігодка, будзе лепш. На што бацька злосна адказваў: скончыцца пяцігодка – пачнецца яшчэ якая халера. Тут лепш ня будзе. Я не спрачаўся, але думаў: ну чаго бацька не разумее – вось жа газеты пішуць! Такая наіўнасьць! Аж цяпер сорамна за яе перад бацькам, якога даўно няма.

Пра лён пісаў ужо, як “выбівалі” яго з сялянаў. Тое ж з хлебам. Сходы, вобыскі, арышты сабатажнікаў. Неяк надумалі пабіць жорны, каб не малолі, здавалі збожжа дзяржаве. Пайшлі па вёсцы і ва ўсіх пабілі верхнія камяні. Пабілі і ў нас, кінулі кавалкі ў крапіву пад плот. Але бацька змайстраваў абручы і ноччу, як пасьне вёска, неяк змацуе тыя кавалкі і паціху зьмеле на хлеб. А ранкам кіне тыя ж кавалкі на ранейшае месца ў крапіву, бо хадзілі, правяралі, ці ляжаць там, куды яны кінулі.

Зрэшты, тое апісана мною ў “Сьцюжы”. Гэта ўжо ня выдумка, гэта балючая праўда.

Вучні ў новай (нядаўна пабудаванай за царквой) школе былі розныя па нацыянальнасьці, у асноўным беларусы. Хоць шмат было і яўрэйскіх дзяцей з мястэчка. Круглы выдатнік (шматгадовы) быў у нас Сьвярдлоў Мэер, старэйшы за мяне гады на два-тры, з ім мы разоў колькі езьдзілі

ў Вушачу на якія школьныя мерапрыемствы, аднойчы ў лагер у Стайкі. З ягоным стрыечным братам Лёвам мы вучыліся ў адным класе. Было нямала і дзяўчат-яўрэек. Амаль усе яны загінулі ў верасьні 1941 году ў рове пад магільнікам каля Ушачы. Мэер Свярдлоў, праўда, пасьля вайны жыў у Маскве, працаваў у нейкай паштовай скрынцы. Адносіны беларусаў і яўрэяў былі абсалютна нармальныя, сяброўскія: я ня памятаю ніводнага канфлікту на нацыянальнай глебе. Вясковыя хлопцы сябравалі з местачковымі, так, як іхнія бацькі і дзяды сябравалі. Местачкоўцы-яўрэі былі гандляры і рамесьнікі, кавалі, ваўначосы, лудзільшчыкі, паяльшчыкі, шаўцы і краўцы. Мая маці, напрыклад, усё жыцьцё мела прыязнасьць да Рывы-Рывіткі, як яна яе звала, што была краўчыха. Яна часам шыла нам пінжакі, кашулі, за якія маці плаціла то кавалкам сала, то яйкамі. Па ўзаемнай згодзе і выгадзе.

Выяўленчае мастацтва ўвайшло ў маю душу з малюнкаў, кніжных ілюстрацыяў. Асабліва захаплялі гравюры ў старых кнігах Жуль Верна і іншых. Сам ахвотна маляваў з першых класаў і, вядома, афармляў (здаецца, ва ўсіх класах) насьценгазету. Неяк сьпісаўся з Домам мастацкага выхаваньня дзяцей (у Менску?), адтуль прыслалі папулярныя брашуры з парадамі, як маляваць акварэльлю. Неяк стала вядома, што наш піянерважаты Кандрацкі паступіў у Віцебскае мастацкае вучылішча, аднойчы (улетку, здаецца), расказваў пра сваё там навучаньне.

Між тым у тыя перадваенныя гады мае старэйшыя таварышы, з якімі я пачынаў вучыцца, заканчвалі школу і разьляталіся, хто куды. Большасьць – у вайсковыя вучылішчы – артылерыйскія, лётныя. Юнацкі неспакой ахапіў і мяне, карцела кудысьці ехаць. Жыцьцё ў калгасе не рабілася лягчэйшым, хутчэй наадварот. Але я не хацеў быць вайскоўцам, я хацеў стаць мастаком. І вось аднойчы ўлетку пайшоў у школу і ўзяў свой атэстат за дзявяты клас. Дырэктар Сьлімборскі не хацеў аддаваць; заставаўся адзін год да сканчэньня, зноў жа – выдатнік. Але аддаў. Бо я сказаў: паспрабую, паступлю дык паступлю, а не, дык вярнуся.



*Маё возера.*



*Возера Супонец.*

Сабраў дакументы, некалькі малюнкаў – алоўкам і акварэльлю – і паслаў у Віцебск.

На ўступныя экзамены я першы раз у жыцьці ехаў чыгункай, першы раз убачыў вялікі горад. Тыдзень ці болей жыў у інтэрнаце на Магілёўскай плошчы, здаваў экзамены. Пасьля вярнуўся дамоў і пачаў чакаць выкліку.

Прыйшла тэлеграма: прыняты. Пачатак заняткаў з першага верасьня. Тое радавала і трывожыла, асабліва бацькоў. Не было ні вопраткі, ні абутку. Ні грошай. У дзень ад'езду бацька запрог каня і заехаў у Двор да дзядзькі Сьцёпкі, пазычыў тры чырвонцы. З імі я і паехаў у вялікі сьвет. На станцыю Фарынава, адтуль – на Полацак.

Памятаю, ішоў дождж. Бацька заклапочана маўчаў. А я думаў, дзе ўзяць фарбы, бо, сказалі, фарбы трэба мець свае.

Усё тое лета дома было галаднавата, хлеба не было з зімы, бульбачка паявілася толькі ў канцы жніўня. Тая галаднаватасьць была маёй спадарожніцай і ў горадзе, заўжды хацелася есьці. Порцыя пярловай кашы з лыжачкай масла ў сталоўцы каштавала 60 кап., але была дужа маленькая тая порцыя. А купіць другую…

Вясковая сарамлівасьць яшчэ доўга прыгнятала характар 15-гадовага падлетка. Бохан хлеба каштаваў рубель, гэта быў наш асноўны наедак. Але за ім трэба было раненька ўстаць, каб заняць чаргу і да дзевяці гадзінаў купіць свой бохан. Пасялілі нас чатырох у яўрэйскай сям'і на Смаленскім базары, апроч мяне быў яшчэ хлопец са Смаленшчыны, другі з Каўказа (Аганясян) і Алёшка з Коханава. Мы былі самыя бедныя. Я хадзіў да зімы ў брызентавых гамашах, з якіх вылезьлі пальцы, а Алёшка з верасьня шкломаў у бурках. Зімой, праўда, яму стала самы раз. Затое мне стала ніяк.

Мастацкае вучылішча зьмяшчалася ў старым асабняку каля гарадской ратушы (музею) з класамі і студыямі на першым і другім паверхах. На першым паверсе з вялікім акном была майстэрня дырэктара вучылішча І. Ахрэмчыка, дзе заўсёды стаяў вялізны, на ўсю сьцяну, падрамнік са шматфігурнай кампазіцыяй. Часам там можна было бачыць мастака з палітрай у руках. Мы малявалі нацюрморты – кубкі, жбаны, часам садавіну, бульбіны. Ну і, вядома, натуршчыкаў. Жывапіс выкладаў Лейтман, ціхі, удумлівы мастак. У канцы месяца плацілі стыпендыю – 60 руб. На тое ў асноўным жылі.

Як вядома, горад – гэта перш за ўсё вуліцы і плошчы, затым будынкі, магазіны, музеі. Мне вельмі падабаліся некаторыя віцебскія вулкі: Замкавая, Вакзальная, стары мост цераз Віцьбу, знакамітыя віцебскія ровы. Але былі і найбольш улюбёныя мясьціны, і гэта найперш музеі. Музей Пэна з мноствам яго самых звычайных па зьмесьце карцінаў: шаўцы, старыя яўрэі, вуліцы гораду. На лесьвіцы вісеў партрэт (галава) каня,

за якую аўтар атрымаў медаль на нейкай парыжскай выставе. Карціны іншага зьместу былі ў галерэі за ратушай, з іх помню “Отцелюбие римлянки” – на антычную тэму. Добра, што для студэнтаў вучылішча ўваход у музеі быў бясплатны, і гэта дазваляла хадзіць туды часта і быць там колькі пажадаеш. Асабліва ў сьцюдзёную пару.

У вучылішчы арганізавалася скульптурнае аддзяленьне, на якое, здаецца, не было набору. Ужо ў пачатку навучальнага году пачалі агітаваць некаторых пераходзіць на яго з жывапісу. Ня надта хацелі, большасьць жадала быць жывапісцамі. Тады дырэктар аддаў загад і прыклаў да яго сьпіс з паўтара дзясяткам асобаў. Там аказалася і маё прозьвішча. Некаторыя пайшлі спрачацца, я не пайшоў. Тым болей, што ўжо тыдзень я не займаўся жывапісам – скончыліся фарбы. З гэтымі фарбамі быў немалы клопат – акварэльныя я мог неяк агораць на сваіх грашах, але на алейныя грошай не было. Пазычаў у некаторых, падбіраў сплюшчаныя цюбікі. Тое, вядома, не магло не адбіцца на маіх жывапісных посьпехах, і я думаў: што ж, скульптурнае, дык скульптурнае. Тым больш, што з малюнкам у мяне праблем не было.

Скульптурнае разьмяшчалася ў тым жа памяшканьні, толькі ўваход у яго быў з двара. Выкладала добрая клапатлівая скульптарка Бяляева. Ужо яна столькі праяўляла клопату, каб зацікавіць і навучыць. Ляпілі з гліны антычныя профілі – насы, вушы, вусны. Была і кампазіцыя. Здаецца, у мяне прарэзаліся і тут здольнасьці – мая кампазіцыя (пагранічнік з біноклем) была прызнана найлепшай. Бяляева хваліла. І я быў рады.

Неяк увосень прыйшла сумная навіна: студэнтам вучылішча ня будуць плаціць стыпендыю. Сьпярша не паверылі: а як жа тады жыць? Вельмі многія з нас жылі толькі на стыпендыю, болей нічога ня мелі. Асабліва гэта адносілася да дзяцей калгасьнікаў. Стала так, што ўжо колькі дзён у маёй кішэні не было ні капейкі. Ды і ў маіх сяброў таксама.

Пачаўся пошук працы. Увесь дзень да зьмярканьня бадзяліся па горадзе, каб знайсьці якую работу. Два дні на станцыі разгружалі вагоны з рубероідам. Нацягаліся, папэцкалі кашулі. Сказалі, заплоцяць заўтра, трэба прыйсьці ў кантору. Як назаўтра прыйшлі, сказалі, каб прыйшлі пасьлязаўтра. А пасьлязаўтра аказалася, што таварыш Кулеш зьехаў у адпачынак, а без яго ведамасьць ніхто не падпіша.

Аднойчы я зайшоў да прыватніка, які ў нейкай кануры шыў шапкі і прапанаваў яму зрабіць шыльду. Той пагадзіўся. Я знайшоў у вучылішчы фанерыну памерам 1,5 х 0,35 метры, неяк загрунтаваў яе і напісаў “Пошив головных уборов”. З бакоў намаляваў кепку і капялюш. Прынёс майму заказчыку. Той доўга глядзеў, а пасьля сказаў, што ня возьме. “Чаму?” – “Таму, што тут капялюш. Я капелюшоў не раблю. Капелюшы рабілі для паноў. А ў нас паноў няма”. Што было рабіць? Цягнуў цераз увесь горад гэтую рагаціну-дошку, а цяпер куды з ёй? Кінуў я шыльду

ў крапіву за сьцяной і, ледзь ня плачучы, павалокся на Смаленскі базар. А дзён праз колькі, апынуўшыся на Магілёўскай плошчы, убачыў сваю шыльду над дзьвярыма тае кануры-будкі. Толькі капялюш быў чымсьці замазаны. Але зайсьці па плату не хапіла адвагі.

Неяк мы з Аляксеем наняліся на Смаленскім базары перанесьці дровы з аднаго двара ў другі. Пайшлі за дзядзькам кудысьці на Суражскую шашу. Дроваў была процьма – цэлы штабель бярозавага бярвеньня, і мы цягалі яго ўвесь выхадны дзень да вечара. Увечары гаспадар добра нас накарміў і даў па пяцёрцы. То быў шчасьлівы дзень, хоць мы тады ледзьве дабрылі да сваёй халупы – ад стомы.

Аднак такіх удачаў было мала, часьцей усе нашы спробы заканчваліся фіяска. Цэлыя дні хадзілі галодныя. Абыходзіліся кіпятнем, чайнік якога заўсёды ўранку нам гатавала гаспадыня. Пасьцельная бялізна (коўдры) у нас былі свае, хатнія. І аднойчы, згаладнеўшы, я панёс сваю, мамай тканую стракатую коўдру ў скупачную. "Ну, у крыжык, каму гэта цяпер патрэбна?" – сказалі там і не ўзялі. Іншага ў мяне нічога не было прадаць. Апроч кашулі. Зеленаватай, з адкладным каўняром. Верхнюю сьвітку надзеў на голае цела, а кашулю аднёс у камісійную краму. Далі за яе рублёў дванаццаць.

З тымі грашыма ў кішэні занёс у вучылішча заяву аб адлічэньні. Тады такія заявы падавалі многія, многія пакідалі вучобу. На днях зьехаў у сваё Коханава мой Лёшка. Дырэктар Ахрэмчык нешта прабурчэў, накшталт таго, што, маўляў, як бы пасьля не пашкадаваў, ды падпісаў маю заяву.

У той жа дзень купіў білет да Фарынава і на рэшту дзьве пышкі, якія зжаваў па дарозе. Да цягніка сядзеў у старым парку каля таго месца, дзе ў Дзьвіну ўпадае Віцьба, і сэрца маё аблівалася сьлязьмі. Сьлязьмі па мастацтву, якое я так палюбіў. Ды не было суджана.

У Фарынава цягнік прыйшоў уначы, да позьняга восеньскага сьвітаньня было далёка. Я сядзеў у цёмным вакзальчыку, чакаў, пакуль павіднее. Яшчэ там чакала дзяўчына, гэткая ж гаротная, як і я – ехала з Віцебску, з аптэчнага тэхнікуму ў вёску. Мы з ёй, можа ўпершыню, пагаварылі аб нашай няласкавай долі, пра крушэньне нашых мараў. Як трохі павіднела – разышоўся кожны ў свой бок. Мне да дому заставалася 30 кіламетраў пехатой. Пабрыў па гразкай дарозе з няцяжкім чамаданчыкам у руках…

Зноў пайшоў у Кубліцкую школу заканчваць дзясяты клас. Але доўга вучыцца там ужо ня мог. Ды і не было як. Вучобу ў старэйшых класах зрабілі платнай. А дзе было ўзяць грошы? З калгасу зусім нічога не давалі, хлеба не было ўжо з восені. Недзе ў пачатку зімы пачалі арганізоўвацца школы ФЗН, пайшоў набор моладзі. Набіралі ў асноўным у школы будаўнікоў. Адна з такіх школаў была ў Віцебску, і я наважыўся. Недзе ў пачатку сьнежня зноў прыехаў у Віцебск. Дакументаў аб адукацыі тут не пыталіся, і мае засталіся ў Кублічах. Пасялілі нас сьпярша над ровамі, а пасьля перавялі ў вызваленую для таго сярэднюю школу на вуліцы

Гогаля. Тут была дысцыпліна, парадак. На заняткі хадзілі на Маркаўшчыну, строем пад камандаваньнем старасты і майстра. Мяне вызначылі ў групу муляроў. Вуглы, калоны, тычкі, ложкі, кельмы і правілы… Было малацікава, сьцюдзёна ў цэхах, але кармілі. А затым выдалі вопратку – фірменнае адзеньне з літарамі ФЗН-5 у пятліцах… Сумаваў па мастацтву, у вольны час бегаў у музеі. Часам увечары падыходзіў да мастацкага вучылішча, заглядваў у нізкія вокны скульптурнага класу, узіраўся ў знаёмыя твары шчасьліўчыкаў. Але не зайшоў ні разу.

Вясной перад выпускам школы стала вядома, што паедзем працаваць на Украіну. Неяк адпрасіўся на выходны і паехаў дадому. Трэба было забраць дакументы ў Кубліцкай школе. Зайшоў да дырэктара. Той распытаў, як і што. Знайшоў мой табель 10 класу з адзнакамі за першае паўгоддзе. Падумаў і сказаў: “Што мне з табой рабіць, выдатнік Быкаў?” І сваёй рукой прыставіў мне адзнакі за другое паўгоддзе, гэткія ж, якія стаялі за першае. Усё завэрыў пячаткай, сказаў: “На, яшчэ спатрэбіцца, муляр”.

Пагодлівым летнім днём усёй групай ехалі на Украіну. Орша, Крычаў, Хутар Міхайлаўскі. Першы раз я пакідаў мілую радзіму – Беларусь, ня думаў тады, ці надоўга. Паволі зьнікалі драўляныя хаты, пайшлі сёлы з белымі мазанкамі. Успаміналіся Гогаль. Тое, што чытаў у ягоных творах, як жывое, паўставала перад вачмі.

Увечары, як зайшло сонца, аблёг нейкі дужа чырвоны небасхіл. Чырваньню заліло паўнеба. Падумалася з трывогай: што б гэта значыла?

Значыла, вядома, кепскае.

Прыехалі ў Шостку – невялікі гарадок на Чарнігаўшчыне. У ваколіцах убачылі руды, ссохлы лес. Пасьля аказалася, атручаны хімічным заводам. Парахавым заводам. На невялікі горад тры хімічныя вайсковыя заводы. І тыя пашыраліся, разбудоўваліся. Патрэбны былі будаўнікі. На тое нас вучылі. Для таго мы прыехалі.

Зноў жылі ў інтэрнаце, аднапавярховым бараку, і нешта будавалі. Здаецца, жылы дом. Механізмаў ніякіх, усё – цэглу, раствор, рыштаваньні – па страмянках, на сабе, у тачках. І – нормы выпрацоўкі. Заробак самы жабрацкі, толькі каб як пракарміцца. У вольны час – грамадская камсамольская работа. Мяне абралі сакратаром. Пачаліся планы, сходы, паседжаньні. Не падабалася мне гэта страшэнна. Але мусіў. Вымагалі найперш з гаркому камсамолу, вядома.

І тут – вайна...

*(Працяг у наступным нумары)*